**Матырка, В.** У гарах Афганістана / В. Матырка // Лепельскі край. — 2010. — 22 студз. — С. 4.

# У ГАРАХ АФГАНІСТАНА

Класны кабінет гэтага настаўніка не падобны на класічны. Акрамя вучнёўскіх сталоў, стаяць стол тэнісны, спартыўныя трэнажоры, а сцены ўвешаныя плакатамі з выявай і характарыстыкамі баявой тэхнікі розных краін і эпох. Савецкі танк 30-х – 40-х гадоў БТ-7 суседнічае з сучасным амерыканскім ударным верталётам «Апач». Ды і сам класны кабінет месціцца ў даволі непрывычным месцы – падвале школы, ён жа цір для стральбы з малакаліբернай вінтоўкі. Гэта цэнтр дапрызыўнай падрыхтоўкі пры Бароўскай школе, а кіруе ім палкоўнік у адстаўцы Султан Джумагаліеў.

У 1979 годзе старшы лейтэнант Султан Джумагаліеў, выпускнік Ульянаўскага вышэйшага каманднага гвардзейскага танкавага двойчы Чырвонасцяжнага вучылішча імя Леніна служыў камандзірам роты у 24-ым гвардзейскім танкавым палку пятай мотастралковай дывізіі.

– Калі нас уводзілі ў Афганістан 27 снежня 1979 года не было адчування, што пачынаецца вайна, – успамінае Султан Лаікавіч. – Меркавалі, што нас уводзяць як у Чэхаславакію ці Германію. Першае, на што звярнулі ўвагу, – розніца ў летазлічэнні. Мусульманскі свет вядзе летазлічэнне з еўрапейскага 622 года, па месяцавым календары, таму на момант уваходу савецкіх войскаў у Афганістане ішла доугая палова чатырнаццатага стагоддзя. Як сказаў адзін прыяцель, мы зайшлі за пятнаццаць год да Кулікоўскай бітвы.

Афганцы жылі ў глінабітных хацінах. Электрычнасць мелася толькі ў буйных гарадах і толькі ў цэнтральных кварталах. Гарадскія ўскраіны і вёскі з заходам сонца патаналі ў цемры. Самай галоўнай прыметай афганскага сярэднявечча былі спецыфічнае светаўспрыманне, псіхалогія людзей. Ісламскі светапогляд і тысячагадовыя традыцыі змагання – вось аснова гэтага народа. Ідучы ў бой, афганец свята верыў, што ў выпадку гібелі яго душа перанясецца у рай, дзе яе чакае вечнае жыццё ў зялёных садах з усімі асалодамі, якіх не хапала на зямлі. Таму ён ваюе храбра, самаадданa, часта ахвяруе сабой дзеля выканання баявой задачы. Да таго ж, мясцовасць Афгана спрыяе партызанскай вайне, учыненню засад.

*– Шмат было страт у першыя дні?*

– Не дужа. Хаця, прызнаю шчыра, магло быць значна больш. Часта нам, танкістам, ставілі задачы неўласцівыя, што магло прывесці да вялікіх ахвяр. У першую чаргу гэта рух калонамі і дзяжурства на аддаленых кропках без суправаджэння пяхоты. Аднойчы рухаліся па горнай дарозе. Спераду ішоў танк, наступны – грузавк з боепрыпасамі, я ў ім. раптам з-за каменя на бліжэйшай гары паказаўся гранатамётчык, выстрал – з танка пайшоў дым. У тую ж секунду з навакольных схілаў нас пачалі апрацоўваць стралкі. Добра, што танк адразу не спыніўся, здолеў прайсці яшчэ метраў 400, вывеў калону з-пад абстрэлу. Пяхоты, якая б магла даць дастойны адпор, не было, а танк, калі б спыніўся і ўвязаўся ў працяглы бой, стаў бы нерухомай мішэнню, якую б дабілі другім-трэцім выстралам з гранатамётаў. Ды яшчэ машына з боепрыпасамі…

*– Успомніце ваш першы бой.*

– Было гэта ў хуткім часе пасля ўводу. Месца, дзе мы сталі лагерам, абстралялі з мінамётаў. Хаваліся хто куды, пра арганізаванае супрацоўленне і гаварыць няма чаго. Усе страху нацярпеліся. Потым навучыліся перамагаць яго, дзейнічаць у экстрэмальнай абстаноўцы.

*– Калі закончылася ваша служба ў Афганістане?*

– Праз паўтара года, у ліпені 1981-га мяне замянілі. Уваходзіў старшым лейтэнантам, камандзірам танкавай роты, заканчваў службу ў Афгане капітанам, начальнікам штаба танкавага батальёна. Адразу пасля гэтага быў прызначаны камандзірам батальёна ў Арджанікідзе (сучасны Уладзікаўказ). Займаў розныя пасады, службу скончыў камандзірам танкавага палка, дыслакаванага ў Бароўцы, палкоўнікам.

*– З пазіцый сённяшніх, якія шанцы на поспех у Афганістане ў натаўцаў?*

– Ніякіх. Афганцы – не той народ, які можна перамагчы, псіхалогія не тая. Яшчэ з часоў Аляксандра Македонскага яны мужна і годна адстойвалі сваю незалежнасць, давалі смела адпор любому. Перамагчы іх можна толькі знутры, змяніўшы іх саміх, перацягнуўшы людзей на свой бок.

**В. Матырка**